http://edoc.bseu.by:8080

Творчасць беларускіх мысліцеляў з'яўляецца пацверджаннем высокага еўрапейскага ўзроўню палітыка-прававой думкі Беларусі, наяўнасці ў ёй тэндэнцый, апераджаючых час.

**Літаратура**


1. *Падокшын С.А., Сокач С.Ф.* Палітычная і прававая думка Беларусі 16—17 стст. Мн., 1999.
2. *Шалькевіч В.* Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі. Мн., 2002.
3. *Сапега Л.* Письмо...Юзафату Кунцевичу от 12 марта 1622 года // Памятники философ. мысли Белоруссии XVII—первой половины XVIII в. Мн., 1991. С. 76.
4. *Саверчанка І.* Aurea mediocritas. Кніжна-пісьмовая культура Беларусі: Адраджэнне і ранняе барока. Мн., 1998.
5. *Skarga P.* Kasania Sejmove. Warsawa, 1912.
6. *Алізароўскі А.* Пра палітычную супольнасць людзей // Мысліцелі і асветнікі Беларусі X—XIX стст.: Энцыкл. дав. Мн., 1995.


## ЭКАНАМІЧНАЯ ГІСТОРЫЯ Ў СЦЕНАХ БДЭУ


*В.І. Галубовіч, З.В. Шыбека,*
*кандыдаты гіст. навук,*
*прафесары*


Даволі вядома, што ў Беларусі як навука і вучэбная дысцыпліна існуе эканамічная гісторыя, але, акрамя спецыялістаў, мала каму зразумела, што гэта такое па сваей сутнасці. Хоць і выдадзены навуковыя працы, адпаведныя дапаможнікі, але яны чытаюцца пераважна навукоўцамі і студэнтамі. Таму і ўзнікла неабходнасць напісаць гэты артыкул, каб больш дакладна вызначыць месца эканамічнай гісторыі ў навучальна-выхаваўчым працэсе універсітэта, паказаць асноўныя этапы яе станаўлення і развіцця.

Эканамічная гісторыя належыць да гуманітарных навук і вывучае развіццё гаспадарчай дзейнасці людзей, вынікі іх дзейнасці і фактары, што ўплываюць на гэту дзейнасць. Прадметамі асобай зацікаўленасці гісторыка-эканаміста з'яўляюцца паходжанне і развіццё розных тыпаў гаспадаркі, а таксама эканамічныя трансфармацыі, якія адбываюцца ў канкрэтных сацыяльна-гістарычных умовах.

Эканамічная гісторыя зарадзілася на сумежжы двух навук — эканомікі і гісторыі. Спачатку гісторыка-эканамічныя

апісанні праводзіліся ў рамках эканамічных даследаванняў, якія імкліва развіваліся ў краінах Заходняй Еўропы ад канца XVIII ст. у сувязі з бурным эканамічным прагрэсам. Затым, пасля з'яўлення ў другой палове XIX ст. дзяржаўнай статыстыкі, сталі пашырацца эканамічныя сюжэты ў рамках гістарычных даследаванняў. Інтэграцыя адзначаных фрагментаў эканомікі і гісторыі ў эканамічную гісторыю як асобную навуку адбылася ў пачатку XX ст. Якраз тады ў еўрапейскіх універсітэтах ствараліся кафедры эканамічнай гісторыі і ўзнік шэраг навуковых гісторыка-эканамічных часопісаў: нямецкі «Квартальнік па сацыяльнай і эканамічнай гісторыі» (1903), французскі «Агляд сацыяльнай і эканамічнай гісторыі» (1913), галандскі «Гісторыка-эканамічны штогоднік» (1915), англійскі «Агляд эканамічнай гісторыі» (1927), амерыканскі «Часопіс эканамічнай і дзелавой гісторыі» (1927) і інш.

Ля вытокаў эканамічнай гісторыі стаялі: у Францыі — Фюстэль де Куланж Нума Дені (1830—1889) і Марк Блок (1886—1944), у Германіі — Карл Маркс (1818—1883), Карл Бюхер (1847—1930), Вернер Зомбарт (1863—1941) і Макс Вебер (1864—1920), у Англіі — Арнольд Тойнбі (1852—1883), у ЗША — Йозеф Алоіз Шумпетер (1883—1950), у Расіі — Васілій Варанцоў (1847—1918) , Мікалай Даніельсон (1844—1918), Аляксандр Лапа-Данілеўскі (1863—1919), Міхаіл Туган-Бараноўскі (1865—1919), Пётр Струве (1870—1944), Уладзімір Ульянаў (Ленін) (1870—1924) і інш.

Эканамічная гісторыя мае шмат агульнага як з эканомікай (эканамічнай тэорыяй), так і з гісторыяй і ў той жа час выразна ад іх адрозніваецца. Калі эканоміка даследуе эканамічныя заканамернасці, то эканамічная гісторыя — канкрэтна-гістарычны вопыт гаспадарчага развіцця. Калі гісторыя разглядае эканоміку ў якасці аднаго з прадметаў свайго вывучэння, то эканамічная гісторыя вывучае толькі эканоміку. Гэта навука мае інтэграцыйны характар, паслугоўваецца матэматыка-статыстычнымі і пераважна гістарычнымі метадамі даследавання, а таму ўваходзіць у сістэму гістарычных навук.

Эканамічная гісторыя дзеліцца на айчынную і замежную. Яна выкладаецца ў вышэйшых навучальных установах эканамічнага профілю ўсяго свету. Ад 1960 г. дзейнічае Міжнародная асацыяцыя гісторыкаў-эканамістаў, рэгулярна праводзяцца міжнародныя кангрэсы і канферэнцыі, ствараюцца спецыяльныя даследчыцкія цэнтры (Еўрапейская асацыяцыя па банкаўскай гісторыі, Еўрапейская асацыяцыя гісторыі бізнесу). Шырокую вядомасць набылі даследаванні прадстаўніка фран-

цузкай школы «Аналаў» Фернана Броделя (1902—1985), «кванціфікатара» ці прыхільніка выкарыстання матэматычных метадаў Р. Фогеля (ЗША), аўтара тэорыі стадый эканамічнага росту амерыканскага даследчыка Уолта Уітмена Растоу.

У Беларусі асновы эканамічнай гісторыі закладзены ў працах знакамітага гісторыка М.В. Доўнар-Запольскага (1867—1934). Яе далейшае станаўленне знаходзілася пад моцным уплывам расійскай, а потым савецкай дзяржаўнай дактрыны. У царскі перыяд, з 1863 г., Беларусь не мела ВНУ. Выкладанне эканамічнай гісторыі пачалося ў 1921 г. на факультэце грамадскіх навук БДУ, дзе рыхтаваліся кадры эканамістаў вышэйшай кваліфікацыі. Адначасова са стварэннем у 1933 г. Беларускага інстытута народнай гаспадаркі (БІНГ) там уводзіўся і курс эканамічнай гісторыі, які выкладаўся па-беларуску. Адпаведная кафедра ўзнікла ў 1968 г. у складзе шасці выкладчыкаў. Узначальвала калектыў дацэнт Т.П. Трацэўская. Затым загадчыкам кафедры па сумяшчальніцтву з верасня 1968 г. па красавік 1970 г. працаваў член-карэспандэнт АН БССР, прафесар К.І. Шабуня. У 1970—1979 гг. кафедрай кіравалі доктар гістарычных навук, прафесар В.Р. Гняўко, а потым — дацэнт Б.Ф. Ніканові́ч. Яго са студзеня 1985 г. змяніў дацэнт В.І. Галубовіч.

Выкладаўся курс гісторыі народнай гаспадаркі СССР, краін сацыялізму і капіталізму. Эканамічная гісторыя Беларусі спецыяльна не вывучалася, але з другой паловы 1960-х гг. выкладчыкі мелі магчымасць рэкамендаваць студэнтам у якасці дадатковай літаратуры «Экономическую историю БССР» пад рэдакцыяй А.І. Сідарэнкі (Мн., 1966) або «Экономическую историю БССР» пад рэдакцыяй К.І. Шабуні і С.Н. Малініна (Мн.,1969). Супрацоўнікі кафедры займаліся вывучэннем праблем сацыяльна-эканамічнага развіцця савецкай Беларусі (В.Р. Гняўко, В.А. Мілаванаў, Б.Ф. Ніканові́ч).

У 1988 г. кафедру ліквідавалі, гэтак сама як і ўсе аналагічныя кафедры эканамічных ВНУ былога Савецкага Саюза. Аднак вынікам дзейнасці той кафедры стала вылучэнне эканамічнай гісторыі ў якасці самастойнай навучальнай дысцыпліны. Можа, па гэтай прычыне яе выкладанне ў БДІНГ не прыпынялася. Асобная секцыя эканамічнай гісторыі была створана ў складзе кафедры эканамічнай геаграфіі. Некалькі выкладчыкаў (прафесар В.Р. Гняўко, дацэнты В.І. Мілаванаў, Т.І. Паваліхіна, асістэнт А.В. Юнцевіч) чыталі на большасці факультэтаў невялікі курс «Гісторыі народнай гаспадаркі СССР і замежных краін», а таксама спецкурс «Гісторыя народнай гаспадаркі Беларусі».

Ведамасная раздзеленасць эканамічнай гісторыі не спрыяла яе самасцвярджэнню і развіццю. Калі выкладчыцкая дзейнасць гісторыкаў-эканамістаў канцэнтравалася ў БДІНГ, то навуковая — пераважна ў АН БССР. Спецыяльныя навуковыя даследаванні праводзіліся ў Беларусі з 1959 г., калі ў акадэмічным Інстытуце эканомікі, які працаваў з 1931 г., арганізаваўся сектар эканамічнай гісторыі. У аснову вывучэння развіцця народнай гаспадаркі Беларусі клаўся агульнапрынятый тады фармацыйны падыход. У 1937 г. у свет выйшла кніга М.Г. Матусевіча і С.Н. Малініна «Асноўныя этапы развіцця прамысловасці БССР». Яна стала першай навуковай працай, выдадзенай у Беларусі ў галіне эканамічнай гісторыі. Класічным выданнем эканамістаў-гісторыкаў лічыцца кніга «Экономика Белоруссии в эпоху империализма: 1900—1917» (Мн., 1963). У далейшым творчы акадэмічны калектыў выдаў шэраг прац, прысвечаных гісторыі эканамічнага развіцця Беларусі ў гады савецкай улады. А калі гэтая праца была завершана, сектар у 1981 г. зачынілі. Выпуск падобных адна на адну кніг пра гісторыю савецкай эканомікі траціў сэнс. Тым не менш, вынікам дзейнасці сектара было вылучэнне эканамічнай гісторыі ў якасці самастойнай акадэмічнай навукі. Вядомымі спецыялістамі гэтай навукі сталі М.Ф. Болбас, З.І. Геаргідзе, В.А. Мілаванаў, Л.М. Міхневіч, В.І. Дрыц і інш.

Пасля ліквідацыі спецыяльных кафедры і сектара даследаванні ў галіне эканамічнай гісторыі працягваліся ў індывідуальным парадку. Аднак далейшы ход развіцця краіны паказаў неабходнасць узнаўлення арганізацыйных структур. Вядучая роля ў наладжванні выкладання і даследавання эканамічнай гісторыі перайшла да створанай 10 кастрычніка 1991 г. кафедры эканамічнай гісторыі Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта (БДЭУ). Пад кіраўніцтвам і навуковай рэдакцыяй загадчыка кафедры, прафесара В.І. Галубовіча ў кароткі час былі напісаны і надрукаваны неабходныя дапаможнікі. Першы выдадзены ў снежні 1992 г. пад назвай «Эканамічная гісторыя Беларусі 1917—1992 гг.», а праз год — наступны, ужо паўнавартасны (з грыфам Міністэрства адукацыі Беларусі), які ахоплівае эканамічную гісторыю Беларусі са старажытных часоў да сучаснасці — «Эканамічная гісторыя Беларусі» (Мн., 1993). У 1996 і 1999 гг. ажыццёўлены яго другое і трэццяе перавыданне. Апошняя, чацвёртая версія падручніка (дапрацаваная і дапоўненая) надрукавана ў 2001 г. на рускай мове. У наступным годзе ажыццяўляецца другое выданне. З 1995 г. кафедра прыступіла да працы над рускамоўным дапаможнікам «Эканаміч-



2 Зак. 1214

ная гісторыя замежных краін». У тым жа годзе ен быў не толькі напісаны, але і выдадзены. Другое выданне з'явілася ў 1998 г., а трэццяе — у 2002 г. Дапаможнік атрымаў грыф Міністэрства агульнай і прафесійнай адукацыі Расійскай Федэрацыі, а таму набыў шырокую вядомасць на ўсёй постсавецкай прасторы. Праграма параўнаўчага вывучэння эканамічнай гісторыі Беларусі і эканамічнай гісторыі замежных краін распрацавана і ажыццяўляецца ў Беларусі толькі ў БДЭУ.

Там жа, на кафедры эканамічнай гісторыі, створаны шэраг аўтарскіх дапаможнікаў па спецыяльных праблемах: «Эканамічны стан, побыт і гандаль старажытнай Беларусі (IX—XIII стст.) В.І. Галубовіча (Мн., 1997), «История туризма» Г.Ф. Шапавала (Мн., 1999), «Промышленность Беларуси в XX столетии» А.М. Сасіма (Мн., 2001), «История развития денежно-кредитной системы Беларуси» Ю.Л. Грузіцкага (Мн., 2002). Па сваей сутнасці — гэта навукова-асветныя і навукова-метадычныя выданні. Яны дапамагаюць студэнтам засвойваць не толькі навучальную праграму, але і навыкі навуковай дзейнасці падчас нанісання курсавых работ. Вынікі працы выкладчыкаў у распрацоўцы методыкі выкладання гісторыі эканамічных рэформаў знайшлі адлюстраванне ў двух навукова-метадычных зборніках («З гісторыі эканамічных рэформаў на Беларусі». Выд. 1. Мн., 1994; Выд. 2. Мн., 1998).

Кафедра вядзе выкладанне практычна на ўсіх факультэтах, але пры гэтым імкнецца ўлічваць спецыфіку гуманітарнай адукацыі на кожным з іх. Распрацавана шэраг спецкурсаў: «Актуальныя пытанні гісторыі дзяржаўнасці Беларусі» (выкладаўся ў 1991—1999 гг.), «Гісторыя турызму» (з 1994/95 навучальнага года), «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі» (выкладаецца ўпершыню ў краіне з 1994/95 навучальнага года), «Гісторыя міжнародных эканамічных адносін» (з 1995/96 навучальнага года), «Гісторыя грашова-крэдытнай сістэмы Беларусі» (з 1996/97 навучальнага года).

Навукова-метадычныя даследаванні ўсе больш дапаўняюцца спецыяльна навуковымі. Асабліва мэтанакіравана ў рамках эканамічнай гісторыі працуе моладзь кафедры. Спецыяльнасць выкладчыка эканамічнай гісторыі здабываецца цаной уласных намаганняў і сістэматычнай самаадукацыі, бо нідзе адпаведных спецыялістаў у Беларусі не рыхтуюць.

Загадчык кафедры, прафесар В.І. Галубовіч вывучае гаспадарку Беларусі ў IX—XIII стст., гісторыю развіцця ў Беларусі эканамічнай навукі і, у прыватнасці, гісторыю БДЭУ. Яго праца пра старажытную эканоміку паклала пачатак новаму

пакаленню падручнікаў па эканамічнай гісторыі, адкрывае новы жанр навучальнай літаратуры, дзе арганічна спалучаны якасці навукова-папулярных і навукова-метадычных выданняў. В.І. Галубовіч паказаў сябе і добрым арганізатарам. Сведчаннем прызнання арганізатарскіх, выкладчыцкіх і навуковых здольнасцяў загадчыка кафедры з'яўляецца прысваенне яму ў 1997 г. прафесарскага звання, а ў 2000 г. назначэнне спецыяльнага гранта прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Доктар гістарычных навук, прафесар Э.М. Савіцкі прадэманстраваў сваімі даследаваннямі зайздросную навуковую рознабаковасць. Ён вывучаў праблемы архівазнаўства, развіццё рабочага руху ў Беларусі ў 1907—1917 гг., гісторыю Лунінецкага раёна, гісторыю Бунда, сацыяльна-эканамічнае становішча беларускіх яўрэяў у канцы XIX — пачатку XX ст.

Доктар гістарычных навук, прафесар З.В. Шыбека (на кафедры з 1999 г.) — вядомы ўрбаніст Рэспублікі Беларусь. Яго навуковыя інтарэсы звязаны з сацыяльна-эканамічным развіццём гарадоў Беларусі другой паловы XIX ст. і гісторыяй Мінска ў канцы XIX—пачатку XX ст. У 2002 г. ён выдаў у Польшчы дапаможнік па гісторыі Беларусі XIX— XX стст.

Доктар гістарычных навук, прафесар М.А. Бяспалая (на кафедры з 2000 г.) з'яўляецца буйным спецыялістам праблем НЭПа і культурнага жыцця ў Беларусі ў 20-х гг. мінулага стагоддзя.

Дацэнт Ю.Л. Грузіцкі пачынаў навуковыя даследаванні ў галіне эканамічнай гісторыі з праблем эканомікі Беларусі ў гады другой сусветнай вайны, а потым сканцэнтраваў асноўную ўвагу на вывучэнні развіцця грашовага абарачэння і крэдыту. Ім апублікаваны, у прыватнасці, цікавыя матэрыялы пра маладомыя грашовыя рэформы XVII—XVIII стст., 1922—1924 гг. і 1947 г., выдадзены вучэбны дапаможнік па гісторыі грашова-крэдытнай сістэмы Беларусі.

Дацэнт Г.П. Бушчык спачатку распрацоўвала праблемы грамадскай згоды ў мінулым і на сучасным этапе, а потым канчаткова пераключылася на даследаванне развіцця эканамічных сувязей Рэспублікі Беларусь у другой палове XX ст. З 1998 г. яна прыступіла да нанісання доктарскай дысертацыі «Станаўленне, развіцце і трансфармацыя сістэмы эканамічных сувязяў Беларусі ў 1945—2000 гг.»

Аб'ектам даследавання дацэнта Н.І. Палятаевай становіцца купецтва Беларусі і яго эканамічная дзейнасць (1861—1913 гг.). З восені 2001 г. яна знаходзіцца ў дактарантуры і паспяхова працуе над доктарскай дысертацыяй.

*Дацэнт Т.І. Паваліхіна з'яўляецца адным з лепшых знаўцаў* эканамічнай гісторыі замежных краін. Яна вывучае працэсы рэгіянальнай інтэграцыі і ўплыў іх на эканамічнае развіцце краін Еўропы, эканоміку мясцовага самакіравання ў Еўропе і эвалюцыю сусветных валютна-фінансавых стасункаў. Пад яе навуковай рэдакцыяй выйшаў пераклад манаграфіі Анры Дэні «Гісторыя эканамічнай думкі», рыхтуецца вучэбны дапаможнік па гісторыі сусветнай эканомікі і міжнародных эканамічных адносінаў.

Дацэнт А.Ф. Самусік захоплены вывучэннем развіцця сістэмы асветы на беларускіх землях у 70-х гг. XVIII — 30-х гг. XIX ст. Па гэтай тэме ён абараніў у 1998 г. кандыдацкую дысертацыю і мае шэраг публікацый. Зараз жа малады выкладчык паступова пераходзіць да новай для сябе праблематыкі, звязанай з гісторыяй эканамічнай адукацыі ў Беларусі ў XVIII—XIX стст.

Дацэнт А.М. Сасім завяршае працу над кандыдацкай дысертацыяй. Яго тэма — развіцце прамысловасці Беларусі ў XX ст. А дацэнт І.І. Гвардзееў распачаў новы этап у сваей навуковай дзейнасці — даследаванне ў галіне гісторыі фінансаў.

Дацэнт В.Ф. Голубеў лічыцца адным з вядучых спецыялістаў Беларусі ў галіне аграрных адносінаў XVI—XVIII стст. Дацэнт У.А. Сосна (на кафедры ў 1993—1996 гг., а потым — з 2002 г.) спецыялізуецца на даследаванні аграрных адносін у пачатку XIX ст.

Асістэнт Д.М. Чаркасаў мэтанакіравана засяроджаны на вывучэнні эканамічнай гісторыі замежных краін. Ён даследуе, у прыватнасці, сярэднявяковую Францыю і рыхтуецца да абароны кандыдацкай дысертацыі. Асістэнтка Г.В. Аляксашына выбрала ў якасці тэмы кандыдацкай дысертацыі сацыяльна-эканамічнае становішча рабочых і служачых гарадоў Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX ст. Асістэнт Ф.В. Гарбачоў распрацоўвае ў якасці кандыдацкай дысертацыі гісторыю англійскага лібералізму.

Значны ўклад ў станаўленне эканамічнай гісторыі Беларусі ўнеслі ўласна гісторыкі, што спецыялізаваліся на сацыяльна-эканамічнай праблематыцы: З.Е. Абезгауз, Л.В. Аляксееў, Х.Ю. Бейлькін, А.П. Белязо, М.А. Бяспалая, В.Ф. Голубеў, А.П. Грыцкевіч, П.Р. Казлоўскі, З.Ю. Капыскі, Л.П. Ліпінскі, П.Ф. Лысенка, Л.М. Лыч, А.М. Люты, І.Я. Марчанка, В.І. Мялешка, І.В. Палуян, В.П. Панюціч, В.І. Пічэта, М.Т. Раманоўскі, Э.М. Савіцкі, А.М. Сарокін, У.А. Сосна, М.Ф. Спірыдонаў, М.М. Улашчык, К.І. Шабуня, Г.В. Штыхаў, З.В. Шыбека і інш.

У 2000 г. у Інстытуце эканомікі НАН Беларусі створаны сектар гісторыі эканамічных вучэнняў на чале з доктарам эка

намічных навук В.М. Бусько. Гэта падзея сведчыць пра адыход акадэмічнага інстытута ад праблематыкі эканамічнай гісторыі і набліжэнне да тэматыкі эканамічнай тэорыі (эканомікі). Новая навуковая плынь — гісторыя эканамічных вучэнняў — займае прамежкавае становішча паміж эканамічнай тэорыяй і эканамічнай гісторыяй, але ўсё ж уваходзіць у сістэму эканамічных навук.

У сувязі з пераходам Беларусі да рыначных адносінаў перад эканамічнай гісторыяй паўсталі задачы асэнсавання катэгорый рынкавай эканомікі, праблем узаемасувязі эканомікі і палітыкі, міжнароднага вопыту эканамічнага развіцця, ролі і месца краіны ў сусветнай эканоміцы, а таксама задачы выбару канкрэтных мер павышэння эфектыўнасці ўласнай эканомікі, якасці эканамічнага прагнозу, экалагічнай небяспекі і сацыяльна-эканамічнай салідарнасці беларускага грамадства. Пры гэтым прыярытэтнае значэнне мае комплексны разгляд вывучаемых праблем. Узрастае роля эканамічнай гісторыі і як выкладчыцкай дысцыпліны. Яна закладвае адпаведную эрудыцыю будучых эканамістаў і тым спрыяе іх прафесійнаму росту.

Тым не менш, эканамічная гісторыя практычна не выходзіць за межы БДЭУ. Грамадскакарысны патэнцыял маладой навукі выкарыстоўваецца ў Беларусі яшчэ далека не поўна. Не існуе спецыялізаванай аспірантуры, не створаны спецыяльныя навуковыя цэнтры, не арганізоўваюцца адпаведныя навуковыя канферэнцыі. На гістарычных факультэтах нашых ВНУ чытаюцца самыя разнастайныя спецкурсы, толькі не па эканамічнай гісторыі. З улікам актуалізацыі праблем эканомікі ў сучасным жыцці эканамічная гісторыя заслугоўвае да сябе больш сур'езнай увагі.

## Літаратура


1. Архіў кафедры эканамічнай гісторыі. 1968—2002 гг.
2. Архіў Вучонага савета БДЭУ. 1968—2002 гг.
3. Архіў БДЭУ.
4. Архіў Інстытута гісторыі НАН Беларусі.
5. Успаміны выкладчыкаў кафедры.
6. Белорусский государственный институт народного хозяйства им. В.В. Куйбышева. Мн., 1983.
7. Институт экономики Национальной академии наук Беларуси (к 70-летию создания). 1931 — 2001. Мн., 2001.
8. Эканамічная гісторыя Беларусі / Пад рэд. праф. В.І. Галубовіча. 3-е выд. Мн., 1999.
9. Экономическая история зарубежных стран / Под ред. проф. В.И. Голубовича. 2-е изд. Мн., 1998.